суб'ектаў творчасці ў дызайне і адрозніваюцца тым, што кладзецца ў аснову вобраза - чалавек ці змест рэчы.

Аднак у рэчаіснасці яны ўяўляюць у адзінстве два бакі мастацкага вобраза ў дызайне. Так, пры семіятычным аналізе аб'екта дзейнасці ў дызайне рэч як знак семантычна адлюстроўвае тэхнічны (канструктыўны, тэхналагічны), утылітарны (функцыянальны) і фармальны прадметна-пачуццёвы (колер, прастора, рытміка руху, гук, фактура) змест дадзенага аб'екта.

У той жа час семантыка гэтага аб'екта адлюстроўвае асобасны і сацыяльны сэнсы, якія выражаюць адносіны сацыяльнага суб'екта да дадзенага аб'екта. Гэта з'яўляецца суб'ектыўна-каштоўнаснай характарыстыкай рэчы. Яна грунтуецца на культурна-эстэтычнай каштоўнаснай сістэме чалавека і фарміруецца ў рэгіянальным сацыякультурным асяроддзі, асновай якога з'яўляецца традыцыйная культура.

Практычнае ўвасабленне традыцыйнай культуры ў праектную практыку дызайну ставіць шэраг метадычных праблем.

Гэта выдучэнне візуальных вобразных сістэм традыцыйнага культурна-эстэтычнага асяроддзя рэгіёна і іх аналіз мастацкімі сродкамі; распрацоўка методыкі «сепарацыі», трансфармацыі і пераносу на праектныя аб'екты тыповых прымет традыцыйных культурна-эстэтычных сістэм; распрацоўка методыкі аперыравання мастацка-фармальнымі сродкамі пры рашэнні задач уключэння традыцыйнай культуры ў дызайн.

Шаура Р.Ф.,
дацэнт

## МАЛЮНАК ЯК АСНОВА Ў ФАРМІРАВАННІ ВЫЯЎЛЕНЧА-ПЛАСТЫЧНЫХ ВЕДАЎ І НАВЫКАЎ СТУДЭНТАЎ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ «НАРОДНЫЯ РАМЁСТВЫ»

У працэсе навучання па спецыялізацыі «народныя рамёствы» значная ўвага ўдзяляецца дысцыплінам акадэмічнага накірунку - жывапісу, малюнку, кампазіцыі, колеразнаўству, перспектыве, пластанатоміі і інш. Малюнак, напрыклад, выкладаецца на працягу васьмі семестраў. Вучэбная праграма прадугледжана такім чынам, што засваенне матэрыялу пачынаецца ўжо з больш складаных пастановак, улічваючы той факт, што ва універсітэце на ўказаную спецыялізацыю паступаюць у асноў-ным абітурыенты, якія маюць пачатковую мастацкую падрыхтоўку (мастацкія школы, вучылішчы). Але практыка паказвае, што грунтоўных ведаў па малюнку абітурыенты, як правіла, не маюць, нягледзячы на тое, што яны скончылі вучылішча дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ці нават Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава. У гэтай сувязі вучэбная праграма па малюнку складзена з улікам дадатковай нагрузкі ў сэнсе практычнай работы студэнтаў па малюнку.

На працягу семестра студэнты выконваюць асноўную праграму з улікам адпаведнай колькасці гадзін і працуюць самастойна па той ці іншай тэме ва ўмовах аўдыторных пастановак ці выконваюць хатнія заданні - у асноўным накіды ці кампазіцыйныя распрацоўкі.

Сам працэс навучання будуецца ў асноўным па прынцыпу дыферэнцыраванага падыходу да студэнтаў. Кожны студэнт мае свае адметныя асаблівасці характару, свае здольнасці ў мастацтве, веды і навыкі практычнай дзейнасці па малюнку ці па іншых накірунках вучэбна-творчага працэсу. Таму выкладчык імкнецца з кожным студэнтам працаваць індывідуальна, весці яго па шляху засваення графічнай граматы з улікам менавіта яго асабістых якасцей.

У аснову метаду навучання па малюнку пакладзена маляванне з натуры. Гэта садзейнічае развіццю зрокавай памяці і назіральнасці ў студэнтаў. Перш чым прыступіць да практычнай дзейнасці, студэнтам чытаюцца лекцыі, паведамляецца тэарэтычны матэрыял па асновах малюнка, іх знаёмяць з мастацтвазнаўчай тэрміналогіяй.

На практычных занятках педагог тлумачыць усе заканамернасці пабудовы састаўленых у пэўную кампазіцыю прадметаў ці асобных рэчаў, вызначае мэту і задачы працы.

Немалаважнае значэнне ў вучэбным працэсе мае наглядна-ілюстрацыйны матэрыял. Такім матэрыялам з'яўляюцца не толькі рэпрадукцыі з работ вядомых класікаў мастацтва, але і лепшыя работы студэнтаў, якія атрымалі выдатныя адзнакі на праглядзе і ўвайшлі ў фонд наглядных дапаможнікаў кафедры.

Наглядныя дапаможнікі даюць магчымасць візуальна сканцэнтраваць увагу на канечным выніку работы. Тут відаць, як павінна быць пабудавана пастаноўка і тэхнічна выпрацавана ў сэнсе перадачы аб'ёму прадметаў, як павінна быць выпрацавана святло-ценявая характарыстыка.

Асноўны прынцып работы над малюнкам - гэта паслядоўнае выкананне задання, гэта шлях ў пабудове ад агульнага да прыватнага і ад прыватнага праз дэталізацыю да агульнага, ад простага да складанага. З гэтай мэтай ставяцца вучэбныя пастаноўкі на пра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цяглае выкананне натуры і штудыйную прапрацоўку яе дэталей.

Практычная работа над малюнкам развівае ў студэнтаў уменне бачыць і правільна занатоўваць на двухмернай плоскасці ліста паперы канкрэтныя формы прадметаў, якія знаходзяцца ў прасторы, у рэальным асяроддзі. Акрамя таго, усебаковае авалоданне малюнкам дае магчымасць адукавана, прафесійна выконваць мастацкія творы ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. А гэта адна з галоўных задач, якая ставіцца ў падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне народных рамёстваў.

Рынкевіч У.Л.,
дацэнт

## АСНОЎНЫЯ ПЫТАННІ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ АКВАРЭЛЬНАГА ЖЫВАПІСУ

Акварэльная тэхніка жывапісу шырока выкарыстоўваецца ў педагагічнай практыцы як агульнаадукацыйных школ, так і спецыяльных навучальных устаноў. Распаўсюджанасць яе ў сістэме адукацыі тлумачыцца тэхналагічнай прастатой матэрыялу. Але выкарыстанне акварэлі ў прафесійнай творчай дзейнасці мастакоў звязана з бесперапынным развіццём мастацтва, што патрабуе паглыбленага вывучэння выразных магчымасцей і авалодання спецыфіч-нымі прыёмамі акварэльнага жывапісу. Таму пытанні методыкі выкладання акварэлі, як і іншых дысцыплін выяўленчага мастацтва, з цягам часу не страчваюць сваей актуальнасці. Заснаванае на веданні агульных законаў вобразатворa, выкладанне гэтай дысцыпліны мае сваю сістэму, якую ўтвараюць тэматычны план і метадычныя прынцыпы навучання.

Праграма дысцыпліны «Акварэльны жывапіс» у Беларускім універсітэце культуры мае свае асаблівасці з улікам мадэлі будучага спецыяліста, які павінен добра ведаць нацыянальную культурную спадчыну, валодаць тэхналогіямі традыцыйных рамёстваў, а таксама методыкай выкладання дысцыплін выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Структура тэматычнага плана ўключае чатыры часткі, кожная з якіх адпавядае этапу авалодання прафесійным майстэрствам.

I этап. Галоўная задача - навучанне асноўным тэхнікам акварэльнага жывапісу. Тэхніка - гэта мова мастацтва, камунікатыўны сродак перадачы думкі, пачуццяў аўтара. Шырокі дыяпазон тэхнічных прыемаў (адмыўка з аднаразовымі і шматразовымі перакрыццямі, змыўкі, выцкрабанні, выкарыстанне водаадштурхоўваючых сродкаў і інш.) дазваляе глыбей і больш поўна выявіць вобразны змест твора. Асноўная ўвага надаецца танальнай і каларыстычнай цэльнасці работы.

З гэтай нагоды студэнтам прапануецца выканаць ва ўмовах аўдыторыі пяць нацюрмортаў, розных па танальнай насычанасці і каляровай гаме, якія складзены з рэчаў хатняга ўжытку (12 гадзін на кожны). Абавязковым патрабаваннем для ўсіх студэнтаў з'яўляецца свабоднае валоданне тэхнікай заліўкі па сухой паперы. У якасці самастойнай працы студэнты выконваюць чатыры серыі эцюдаў краявіду і копіі з работ вядомых акварэлістаў.

II этап прадугледжвае ўдасканаленне навыкаў рэалістычнага жывапісу. Выкарыстоўваючы вопыт валодання тэхнічнымі прыёмамі, студэнты рашаюць задачы пабудовы арыгінальнай кампазіцыйнай структуры, стварэння каляровай умоўнасці, перадачы планавасці нацюрморта. Асобая ўвага надаецца перадачы матэрыяльнасці рэчаў - выяўленню фактуры тканіны, дрэва, металу, шкла. Аб'ем заданняў складаецца з чатырох аўдыторных пастановак і чатырох самастойных заданняў - чатыры серыі эцюдаў краявіду (на стан прыроды).

III этап. Работа студэнтаў накіравана на стварэнне вобразных задач. Выкладчык прапануе тэму кампазіцыі і забяспечвае яе адпаведнай атрыбутыкай з нацюрмортнага фонду («Восень», «Народнае мастацтва», «Сялянскі побыт» і інш.). На занятках выкарыстоўваецца прынцып «рухомай» пастаноўкі, г.зн. пастаноўка знаходзіцца ў дынамічным стане: кожны студэнт можа дадаваць або ўбіраць рэчы з нацюрморта ў залежнасці ад асабістай кампазіцыйнай задумкі. У адрозненне ад папярэдніх этапаў «прамое» адлюстраванне рэчаіснасці не з'яўляецца абавязковым. Магчыма вольная кампазіцыйная і каляровая структура твора, адмаўленне ад адзінага прасторавага асяроддзя, нават фармальнае бязрэчавае рашэнне тэмы.

IV этап. Адметнай рысай гэтага этапу з'яўляецца пашырэнне выяўленчых сродкаў. Уводзіцца змешаная, або камбінаваная, тэхніка: акварэль з бяліламі, гуаш, тэмпера і іншыя вадзяныя фарбы. Студэнты спачатку выконваюць пастаноўку з гіпсавых рэльефаў у тэхніцы грызайль, а далей тры нацюрморты з рэчаў хатняга ўжытку. У якасці самастойнай працы студэнты выконваюць эцюды і кампазіцыі краявідаў.

Праграма можа быць пашырана або скарэкціравана ў залежнасці ад узроўню першапачатковай падрыхтоўкі студэнтаў. Тыя з іх, якія не засвоілі матэрыял, заданні наступ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ